За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь


№ 7 (90) Ліпень 2014 г.

Палітвязьня Ігара Аліневіча перавялі ў калёнію "Віцьба-3"

Палітвязьня Ігара Аліневіча перавялі ў калёнію "Віцьба-3", дзе раней адбываў пакараньне былы кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Казулін. Бацька палітвязьня Ігара Аліневіча Уладзімер Аліневіч паведаміў, што ягонага сына перавялі з наваполацкай калёніі ў калёнію "Віцьба-3", якая знаходзіцца непадалёк ад Віцебску.

«Мы атрымалі афіцыйнае паведамленьне, што ён знаходзіцца ў калёніі "Віцьба-3". Яго туды прызначыў Дэпартамэнт выкананьня пакараньняў. І гэта ўсё. Ад яго пакуль адтуль лістоў не было. Што і як — дакладна ня ведаем. Хутчэй за ўсё, патрапіў у карантын і таму пакуль ад яго нічога няма», — сказаў Уладзімер Аліневіч.

У калёніі "Віцьба-3" пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2006 году адбываў пакараньне былы кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Казулін. Спадар Казулін сказаў, што яму вядома пра новае будаўніцтва ў калёніі, таму ўмовы ў ёй цяпер могуць быць лепшыя за часы, як ён там быў. «Што такое калёнія? У ёй галоўнае ня ўмовы, а стаўленьне ахоўнікаў і адміністрацыі, адносіны да вязьняў.



Ігар Аліневіч

А ўмовы там могуць быць ня самыя кепскія», — мяркуе Аляксандар Казулін. Пра адміністрацыю "Віцьбы-3" былы палітвязень нічога ня ўзяўся казаць, спаслаўшыся на тое, што там зьмяніўся начальнік.

Ігар Аліневіч раней адбываў пакараньне ў калёніі ў Наваполацку, якая лічылася найгоршай паводле экалёгіі. На пачатку году было прынятае рашэньне аб расфармаваньні гэтай калёніі. Актывіст анархісцкага руху Ігар Аліневіч асуджаны на 8 год зьняволеньня за "хуліганскія дзеяньні адносна афіцыйных будынкаў". Сваёй віны палітвязень не прызнаў.

У Наваполацку распачаўся суд над актывістам Яўгенам Парчынскім



Яўген Парчынскі

21 ліпеня ў Наваполацкім судзе распачаліся судовыя слуханьні па абвінавачваньні грамадзкага актывіста **Яўгена Парчынскага** ў парушэньні крымінальнага закону. Актывісту інкрымінуюць падзеі, якія адбыліся ў 2009 - 2012 гадох, па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэксу. Справу вядзе сам старшыня Наваполацкага суду Ляўчонак Пётар Уладзімеравіч.

У адкрытае судовае паседжаньне падтрымаць Яўгена прыйшлі актывісты грамадзкіх арганізацыяў полацкага рэгіёну і гораду Віцебску. Крымінальны перасьлед актывіста калегі зьвязваюць зь яго актыўнай грамадзка-палітычнай дзейнасьцю. Крымінальныя абвінавачваньні зьвязаныя з пасярэдніцтвам ў атрыманьні фальшывых бальнічных і позваў у міліцыю для трэціх асоб.

У першы дзень суду быў апытаны адзін з грамадзян у якасьці пацярпелага, які нібыта купіў ў жніўні 2012 году падробную позву ў міліцыю, каб апраўдаць прагулы на працы. Пацярпелы блытаўся ў паказаньнях, многія падзеі двухгадовай даўніны ня мог успомніць. Яўген Парчынскі не прызнаў абвінавачваньні, зьвязаныя з махлярствам і падбухторваньнем да дачы хабараў за фальшывыя даведкі, якія вызваляюць ад працы.

Дзіўна, што крымінальныя абвінавачваньні 2009-2012 гадоў супраць Парчынскага перададзеныя ў суд толькі цяпер. У 2014 годзе ён удзельнічаў у мясцовых выбарах, але ня быў зарэгістраваны камісіяй у якасьці кандыдата. У полацкім рэгіёне Яўген вядзе актыўную працу ў грамадзкіх арганізацыях, арганізуе разнастайныя мерапрыемствы, зьдзяйсьняе інфармацыйную працу сярод насельніцтва.

У Воршы забаранілі пікеты

Заяўкі на правядзеньне пікетаў 27 ліпеня ў гонар прыняцьця дэкларацыі аб незалежнасьці Беларусі падавалі сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У горадзе павінны былі прайсьці тры пікеты — каля Кургану Бесьсьмяротнасьці, каля кавярні "Аронія" і ў парку культуры і адпачынку Тэкстыльшчыкаў. Аднак усе тры заяўкі Аршанскі райвыканкам не задаволіў, бо арганізатары не змаглі далучыць да заявак падпісаныя дамовы зь міліцыяй, хуткай дапамогай і прыбіральшчыкамі.

Ініцыятары ставілі сваёй мэтай актуалізацыю каштоўнасьці незалежнасьці нашай краіны і выказваньне салідарнасьці з украінскім народам у справе захаваньня цэласнасьці сваёй краіны. Ані міліцыя, ані хуткая дапамога дамовы на абслугоўваньне пікетаў у Воршы не падпісваюць ужо на працягу некалькіх гадоў.

Віцебскі абласны суд скасаваў пастанову аб прыцягненьні актывісткі да адміністрацыйнай адказнасьці

Актывістка **Надзея Куканос** выклікала міліцыю, каб тая ўгамавала п'яную кабету, якая чаплялася да яе. Калі праз паўгадзіны міліцэйскі нарад прыбыў на месца здарэньня, сьлед дэбашыркі прастыў. Але міліцыянты вырашылі не вяртацца ў свой пастарунак зь мілым ліхам і даставілі туды саму актывістку. У пастарунку на яе быў складзены пратакол — нібыта за фальшывы выклік міліцыі. Потым быў суд — актывістку пакаралі. Надзея Куканос абскардзіла рашэньне пра пакараньне, і — рэдкі выпадак — у абласным судзе прыслухаліся да аргумэнтаў актывісткі. Надоечы пастанову суду першай інстанцыі скасавалі, а справу накіравалі на новы разгляд.

Інцыдэнт, які паклаў пачатак справе, адбыўся ў раёне аўтавакзалу Віцебску яшчэ ў сакавіку. Надзея Куканос прасіла міліцыянтаў, якія прыбылі на яе выклік, каб тыя прагледзелі запісы камэраў назіраньня і апыталі сьведак, што пацьвердзіла б факт канфлікту. Аднак супрацоўнікі міліцыі нічога гэткага рабіць ня сталі.

Пра далейшае распавядае актывістка: *«У мяне адабралі мабільны тэлефон, выкруцілі мне рукі, не далі ўзяць верхнюю вопратку і даставілі мяне ў Чыгуначны РАУС. У дачыненьні да мяне былі складзеныя тры адміністрацыйныя пратаколы: паводле артыкулу 17.6 КаАП — заведама фальшывае паведамленьне, якое пацягнула рэагаваньне супрацоўнікаў міліцыі, паводле артыкулаў 23.5 і 23.4 — зьнявага супрацоўнікаў міліцыі і непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі. У гэты самы дзень я была дастаўленая ў будынак суду Чыгуначнага раёну і судзьдзя Дзягода прыняў да свайго разгляду адміністрацыйныя матэрыялы».*

Надзея Куканос працягвае: *«13 сакавіка суд зрабіў перапынак у судовым паседжаньні да 21 сакавіка. Да 21 сакавіка я самастойна сабрала доказы ўласнай невінаватасьці: выпатрабавала дадзеныя камэры відэаназіраньня і перапісала іх на свой дыск, знайшла ўсіх сьведак і перапісала іх прозьвішчы, аплаціла ім праезд да Віцебску, заключыла пагадненьне з адвакатам і заплаціла яму».*

«І вось 21 сакавіка мы дружнай кампаніяй — я, адвакат і сьведкі — зьявіліся ў судовае паседжаньне. Убачыўшы нашу кампанію, судзьдзя Дзягода, нічым не матываваўшы, судовае паседжаньне праводзіць адмовіўся. А праз 2 месяцы, 16 траўня, я атрымала ліст з позвай, зь якой я даведалася, што мне неабходна прыбыць 13 траўня ў суд. Інакш кажучы, пра месца і час правядзеньня судовага паседжаньня я належным чынам апавешчаная не была. 16 траўня па гэтай позве я ўсё ж прыйшла ў суд і даведалася, што 13 траўня ў маю адсутнасьць, у адсутнасьць адваката, без апытаньня сьведак, без дасьледаваньня якіх-небудзь абставін зьдзяйсьненьня адміністрацыйнага правапарушэньня судзьдзём Дзягодам была сфабрыкаваная пастанова, якой ён прызнаў мяне вінаватай», — распавяла Надзея Куканос.




Надзея Куканос

Цяпер рашэньне ў дачыненьні да актывісткі скасаванае. Судзьдзя Віцебскага абласнога суду Сьвятлана Іванова пагадзілася з Надзеяй Куканос, што справа супраць яе вялася з парушэньнямі працэсуальнага заканадаўства. Але гэта яшчэ не канец — справа перададзеная на новы разгляд. У хуткім часе даведаемся, ці зможа актывістка абараніць сябе ў паўторным судовым паседжаньні.

Кіраўніка прафсаюзнай арганізацыі не пускаюць на «Шкловалакно»

Віктар Стукаў, кіраўнік суполкі Свабоднага прафсаюзу беларускага, хацеў наведаць цэхі № 7 і № 12 ААТ «Шкловалакно», каб спраўдзіць скаргі працаўнікоў на ўмовы працы. Але варта было папярэдзіць пра свой візыт генэральнага дырэктара, як уваход на прадпрыемства яму пэрсанальна забаранілі.


Віктар Стукаў

Распавядае Віктар Стукаў: *«Работнікі скардзяцца на гарачыню ў цэху, а таксама на нейкія шкодныя выпарэньні ў паветры. Праверыць шкоднасьць выпарэньняў ад хімічных рэчываў наш прафсаюз ня можа, аднак сытуацыя трывожная: ня так даўно ў „распранальні“ пасьля зьмены памёр рабочы, якому зрабілася кепска яшчэ ў працоўны час... Адным словам, варта было ўсё паглядзець на ўласныя вочы. Таму я папярэдзіў кіраўніцтва, што 23 ліпеня прыйду ў цэх № 7 і № 12. Аднак на тэрыторыю прадпрыемства мяне не прапусьцілі».*

Спадар Стукаў на «Шкловалакне» не працуе: некалькі гадоў таму яго звольнілі нібыта за парушэньні патрабаваньняў аховы працы. А па сутнасьці, каб зьменшыць уплыў ідэяў СПБ на працаўнікоў, лічыць Віктар Стукаў. Прафсаюзны лідэр мусіў зьвяртацца ў пракуратуру, калі пачалі перашкаджаць яму праходзіць на прадпрыемства.

«Проста на прахадную я выклікаў міліцыю па тэлефоне 102. Міліцыянты склалі пратаколы апытаньня абодвух бакоў. Я патэлефанаваў і ў пракуратуру, да таго супрацоўніка, які раней ужо тлумачыў мне мае правы — што я як кіраўнік прафсаюзнай суполкі маю права бесьперашкодна сустракацца з рабочымі. Гэтым разам пракурор параіў пакінуць адпаведны запіс у Кнізе скаргаў і прапанаваў. Але і яе не ўдалося адваяваць: начальнік аддзелу прававога забесьпячэньня Васіль Заціpaxін загадаў не даваць кнігу скаргаў — маўляў, яна прызначана толькі для водгукаў на якасьць прадукцыі».

Сытуацыю, якая склалася вакол ягонай асобы, Віктар Стукаў лічыць ненармальнай. 24 ліпеня ён падаў заяву ў пракуратуру з просьбай прыслаць на «Шкловалакно» пракурорскае прадпісаньне, каб яго, лідэра СПБ, прапускалі на прадпрыемства, як гэта прадугледжана беларускім заканадаўствам. Таксама ён просіць ацаніць з пункту гледжаньня права паводзіны адказных кіраўнікоў, якія спрабуюць забараняць яму сустракацца з працаўнікамі дзеля абароны іхных правоў.

Адміністрацыйныя адгалоскі веснавых выбараў у мясцовыя саветы


Міхаіл Пятроўскі

Судзьдзя суду Лёзьненскага раёну Віцебскай вобласьці Сьняжана Кіндзеева вынесла пастанову пра спыненьне адміністрацыйнай справы ў дачыненьні да сябра палітвыканкаму Віцебскай абласной арганізацыі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасьці Міхаіла Пятроўскага. Такая пастанова вынесеная ў сувязі з тым, што скончыўся тэрмін накладаньня адміністрацыйнага спагнаньня.

Да адміністрацыйнага перасьледу палітыка спрычынілася тая акалічнасьць, што пры канцы траўня ён зьвярнуўся ў пракуратуру з заявай. Міхаіл Пятроўскі паведамляў пракурору Лёзьненскага раёну Вячаславу Котаву пра два факты незаконнай агітацыі з боку сяброў выбарчых камісіяў у пэрыяд галасаваньня на мясцовых выбарах, якія праходзілі на пачатку бягучага году ў Беларусі.

Праведзеная пракуратурай праверка паведамленьня партыйнага актывіста ня выявіла парушэньняў дзейнага выбарчага заканадаўства. Матэрыялы праверкі былі перададзеныя ў Лёзьненскі раённы аддзел міліцыі, дзе на Міхаіла Мікалаевіча быў складзены адміністрацыйны пратакол аб зьдзяйсьненьні ім праваправапарушэньня паводле арт. 24.4 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях (заведама фальшывае тлумачэньне або заява).

Паводле гэтага артыкулу партыйцу — шукальніку праўды пагражаў штраф у памеры ад дзесяці да пяцідзесяці базавых велічынь або адміністрацыйны арышт. Пасьля складаньня пратаколу міліцыя перадала яго ў суд Лёзьненскага раёна для разгляду па сутнасьці справы. Аднак суд палічыў недастатковай доказную базу для пачатку адміністрацыйнага працэсу, і матэрыялы справы былі вернутыя ў міліцыю на дапрацоўку.

Дапрацоўка зацягнулася, і калі матэрыялы справы зноў аказаліся ў судзе, мінуў двухмесячны тэрмін, на працягу якога, паводле закону, павінна быць разгледжаная адміністрацыйная справа. На гэтай падставе судом і была спыненая вытворчасьць па адміністратыўнай справе ў дачыненьні да Міхаіла Пятроўскага.

Суд вызваліў праваабаронцу ад прымусовага лекаваньня

Як стала вядома, яшчэ пры канцы траўня судзьдзя суду Кастрычніцкага раёну Віцебску Тацьцяна Жураўкова вынесла пастанову аб спыненьні прымусовых мер бясьпекі і лекаваньня ў дачыненьні да віцебскага праваабаронцы Валера Місьнікава. Такога рашэньня суду праваабаронца дамагаўся больш за шэсьць гадоў.



Валер Місьнікаў

Перасьлед Валера Місьнікава з выкарыстаньнем прымусовага псыхіятрычнага лячэньня распачаўся ў верасьні 2007 году. Тады пастановай суду Кастрычніцкага раёну Віцебску да праваабаронцы былі ўжытыя прымусовыя меры бясьпекі і лячэньня ў сувязі з учыненьнем, у стане бесьсьвядомасьці, грамадзка небясьпечных дзеяньняў, прадугледжаных арт. 269 (Абраза прадстаўніка ўлады), ч. 2 арт. 377 (Крадзеж, зьнішчэньне, пашкоджаньне або ўтойваньне дакумэнтаў, штампаў, пячатак, крадзеж блянкаў). Судзьдзя Жураўкова ў закрытым судовым пасяджэньні палічыла даказанымі факты таго, што Місьнікаў публічна абразіў работніка пракуратуры і выкраў з будынку абласной пракуратуры матэрыялы сваёй крымінальнай справы.

Дзеля лекаваньня Місьнікаў быў накіраваны ў УАЗ «Браслаўскі абласны псыхіятрычны шпіталь», які знаходзіцца ў в. Слабодка Браслаўскага раёну Віцебскай вобласьці, дзе ён правёў больш за сем месяцаў. Пад ціскам Сусьветнай псыхіятрычнай асацыяцыі (Швэйцарыя) у траўні 2008 году адміністрацыя псыхлякарні зьвярнулася ў суд з просьбай зьмякчыць ўмовы лячэньня — замяніць знаходжаньне ў закрытым псыхіятрычным шпіталі на прымусовае амбуляторнае назіраньне і лячэньне ў псыхіятра па месцы жыхарства. Хадайніцтва было задаволенае, і да красавіка 2014 году Валер Місьнікаў штомесяц сустракаўся са сваім лечачым урачом-псыхіятрам.

Падчас кожнай сустрэчы з доктарам праваабаронца заяўляў пра тое, што яму няма неабходнасьці ў назіраньні і лячэньні ад псыхіятрычнага захворваньня, бо адчувае сябе здаровым. Ён настойліва патрабаваў ад кіраўніцтва УАЗ «Віцебскі абласны клінічны цэнтар псыхіятрыі і наркалёгіі» вырашыць пытаньне аб спыненьні прымяненьня прымусовых мер бясьпекі і лячэньня.

Але толькі па заканчэньні шасьці гадоў зьнявагаў камісіяй лекараў было вызначана, што ў Місьнікава псыхічны стан палепшыўся і наступіла такое зьмяненьне характару захворваньня, пры якім адпала неабходнасьць у прымусовых мерах бясьпекі і лячэньня ў выглядзе амбуляторнага назіраньня. Камісія клінічнага цэнтру псыхіятрыі і наркалёгіі, аднак, палічыла, што праваабаронцу трэба ўсё ж пакінуць пад дыспансэрным наглядам.

У выніку суду не засталося нічога, як пагадзіцца з рашэньнем мэдычнай камісіі і вынесьці пастанову аб спыненьні ў дачыненьні да Валера Місьнікава амбуляторнага назіраньня і лекаваньня ў псыхіятра.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.